УДК 316. 422:2 (476)

**В. А. АДЗІНОЧАНКА**
(УА «Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Ф. Скарыны»)

# РЭЛІГІЙНЫ АСПЕКТ МАДЭРНІЗАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ : ДА ПАСТАНОЎКІ ПРАБЛЕМЫ

*Рэлігійны аспект мадэрнізацыі ў Беларусі трэба разглядаць у кантэксце агульнай фундаментальнай трансфармацыі грамадства. Па нашаму меркаванню, трэба адрозніваць два звязаных паміж сабой, але істотна розных працэса : па-першае, адмаўленне ад элементаў савецкай спадчыны, і, па-другое, фарміраванне незалежнай дзяржавы. Апошні працэс робіцца ўсё больш актуальным для Беларусі ў ходзе яе гістарычнага развіцця.*

Напачатку хацелася б падкрэсліць актуальнасць самой праблематызацыі тэмы нашых разважанняў. Бо, калі мы не бачым праблемы ва ўсёй яе канкрэтнасці, тады не імкнемся яе вырашаць, альбо шукаем не звязаныя з рэчаіснасцю шляхі вырашэння. Мадэрнізацыя і яе ажыццяўленне на Беларусі мае надзённы характар і абмяркоўваецца як ў сродках масавай камунікацыі, так і ў выступленнях кіраўніцтва краіны. Неабходна паспрабаваць прааналізаваць, што яна сабой ўяўляе, чым абумоўлена і якія яе рысы.

Магчыма, сам разгляд рэлігіі як аднаго з аспектаў мадэрнізацыі падасца парадаксальным. Бо звычайна рэлігія разглядаецца як кансерватыўны элемент, тое, што садзейнічае захаванню старога, а не вядзе да новага. Нават ва ўмовах сучаснага беларускага грамадства, калі паступова адбываюцца істотныя змены ва ўсіх сферах жыцця (а ў галіне свядомасці яны адчуваюцца ў найбольшай ступені) рэлігія ўспрымаецца пераважна як элемент традыцыі, які трэба адраджаць.

Можна задаць пытанне : у чым спецыфіка гэтай неабходнасці? Калі мы кажам пра сучасную Беларусь, то яе пачатак абумоўлены канкрэтнымі падзеямі, сведкамі якіх мы з’яўляемся. Гэта распад Савецкага Саюзу і ўтварэнне на яго месцы незалежных дзяржаў. Развіццё апошніх пайшло рознымі шляхамі, і, як паказаў гістарычны вопыт, шмат ў чым гэта абумоўлена культурнымі традыцыямі той ці іншай краіны. Можна ўзгадаць відавочную розніцу, якая зараз існуе паміж краінамі Прыбалтыкі і Сярэдняй Азіі. А раней іх насельніцтва лічылася часткамі адзінага савецкага

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

народа, а культуры – часткамі адзінай культуры, «сацыялістычнай па зместу і нацыянальнай па форме».

Таму, калі мы разважаем аб мадэрнізацыі беларускага грамадства, дык трэба ўлічваць менталітэт нашага народа, яго гісторыю, у тым ліку і рэлігійную. Зараз актуальна асэнсаваць спецыфіку апошняй. Бо вельмі часта рэлігійная традыцыя ў Беларусі ўспрымаецца па ўзору расійскай. Між тым, яна з’яўляецца якасна іншай. Гэта тычыцца не толькі гісторыі каталіцтва ці пратэстанцтва на нашых землях, але і гісторыі праваслаўя. Менавіта апошнюю нам трэба асэнсаваць у яе сваеасаблівасці.

Дадатковым фактарам, які абумоўлівае неабходнасць праблематызацыі працэсу мадэрнізацыі беларускага грамадства з’яўляецца, на наш погляд, тое, што само гэтае паняцце ўспрымаецца як відавочнае. Яму надаюцца безумоўна станоўныя канатацыі. І тады знікае неабходнасць асэнсавання спецыфікі працэсу мадэрнізацыі ў Беларусі.

Мадэрнізацыя (ад фр. *moderne – новы, сучасны*) – змены, удасканальванне, якія адпавядаюць новым патрабаванням. Вылучаюць дзве яе асноўныя трактоўкі : тэхнічную і гістарычную. У першай мадэрнізацыя разумеецца як абнаўленне машын, абсталявання і вытворчых працэсаў, прывядзенне іх ў адпаведнасць з сучаснымі нормамі, тэхнічнымі ўмовамі і паказчыкамі якасці. Гістарычная мадэрнізацыя азначае працэс пераходу ад традыцыйнага грамадства да сучаснага.

У штодзённай свядомасці і СМІ зараз пераважна разважаюць аб мадэрнізацыі ў яе тэхнічным сэнсе. Таму яна звязваецца з прагрэсіўным развіццём эканомікі і на гэтай падставе – ростам дабрабыту насельніцтва.

Але неабходна паставіць пытанне аб тым, адкуль ўзнікае само імкненне да тэхнічнага развіцця. Праблемай з’яўляецца наяўнасць установак культуры, накіраваных на прагрэс. Беларусь ўваходзіць ў еўрапейскую культурную прастору, і нам гэтая накіраванасць здаецца відавочнай. Але існуюць традыцыйныя культуры, у якіх націск робіцца на захаванне мінулага.

Больш таго, установкі на прагрэсіўнае развіццё сфарміраваліся ў еўрапейскім грамадстве толькі ў Новы час. Менавіта тады ўзнікла вера ў абавязковасць прагрэсіўнага развіцця грамадства. Гэтыя ўстаноўкі неаднаразова крытыкаваліся, самай грунтоўнай падставай для крытыкі з’явіліся падзеі XX ст. : дзве крывавыя сусветныя вайны і існаванне таталітарных рэжымаў.

Мадэрнісцкая канцэпцыя прагрэсіўнага развіцця была адмоўлена ў філасофіі постмадэрнізму, якая была моднай ў канцы мінулага



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

стагоддзя. Згодна з ёй, калі казаць надзвычай спрошчана, гісторыя спыніла свой рух і нічога новага ўжо не будзе. Гэтым настроям адпавядала ідэя канца гісторыі амерыканскага палітолага Ф. Фукуямы. Ён заявіў, што ў сувязі з перамогай Захаду ў халоднай вайне гісторыя набыла безальтэрнатыўны характар і будзе рухацца ў накірунку ліберальнай дэмакратыі і рынкавай эканомікі. Як альтэрнатыва гэтаму аптымізму другім амерыканскім даследчыкам С. Хантынгтонам была прапанавана канцэпцыя «сутыкнення цывілізацый». Хантынгтон сцвярджаў, што на месца канфлікту паміж сацыялістычнай і капіталістычнай сістэмамі прыдзе канфлікт паміж рознымі цывілізацыямі, перш за ўсё – заходняй і мусульманскай. Як паказалі далейшыя падзеі, правым ў гэтай спрэчцы аказаўся Хантынгтон. Для нас яго канцэпцыя мае актуальнасць таму, што, згодна з ёй, тэрыторыя нашай краіны знаходзіцца на пераломе праваслаўнай і заходняй цывілізацый і з’яўляецца зонай канфліктаў. І хаця ў Хантынгтона шмат памылак чыста эмпірычнага плану, але праблемы, якія ён сфармуляваў застаюцца для нас важнымі.

Актуальным з’яўляецца для нас асэнсаванне таго, да якой культуры мы належым, што гэта азначае, і якіх крокаў гэта патрабуе ў нашым далейшым развіцці. Адной з частак самаасэнсавання з’яўляецца адраджэнне нашай культурнай традыцыі. І таму мы ўмоўна можам вылучыць два тыпы мінулага. Першае – гэта мінулае, ад якога нам трэба адштурхнуцца, другое – мінулае, на якое мы можам абаперціся ў сваім далейшым развіцці.

Парадыгмальнай для самаасэнсавання беларусаў з’яўляецца канцепцыя прамежнага становішча паміж Расіяў і Еўропай. У найбольш ясным выглядзе яна была сфармулявана ў працы І. Абдзіраловіча «Адвечным шляхам», якая выйшла ў Вільні ў 1921 годзе. Тады трэба было паказаць, што Беларусь адрозніваецца як ад Расіі, так і ад Польшчы. Але зараз канцэпцыя «прамежнага становішча» з’яўляецца, на наш погляд, недастатковай. Трэба вызначаць рысы нашай культурнай спецыфікі.

Вылучаюць першасную і другасную мадэрнізацыю. Першая адбылася ў Еуропе ў Новы час і звязана з фарміраваннем нацыянальных дзяржаў, развіццём рынкавай эканомікі, індустрыялізацыяй, станаўленнем свабоднага і актыўнага індывіда. Другасная мадэрнізацыя адбываецца ў тых краінах, якія дзеля інтэнсіфікацыі свайго развіцця запазычваюць тыя ці іншыя рысы заходняй цывілізацыі. Адпаведна іх яшчэ называюць арганічнай і неарганічнай мадэрнізацыяй. Першая адбываецца на аснове сваёй ўласнай культуры, другая – на аснове запазычанняў.

Найбольш вядомымі прыкладамі паспяховай другаснай мадэрнізацыі з’яўляюцца Японія і Кітай. Аб іх вельмі любяць разважаць расійскія даследчыкі, бо бачаць ў развіцці гэтых краін магчымасць ажыццявіць мадэрнізацыю на сваёй культурнай аснове. У грамадскай свядомасці і сацыяльнай думцы Расіі распаўсюджана ідэя асобнага шляху развіцця, адрознага ад еўрапейскага. Дадзеная ідэя падцвярждаецца шматлікімі прыкладамі з расійскай гісторыі.

Мы ж знаходзімся ў іншым стане. Тэрыторыя Беларусі доўгі час была часткай еўрапейскай культурнай прасторы, і на ёй адбываліся тыя ж працэсы, што і ў астатняй Еўропе. У галіне рэлігіі гэта, напрыклад, Рэфармацыя, плюралізм рэлігійнага жыцця, наяўнасць традыцыі рэлігійнай талерантнасці.

Такім чынам, правядзенне мадэрнізацыі ў Беларусі магчыма на ўласнай культурнай аснове.

Але, трэба таксама ўлічваць, што на тэрыторыі нашай краіны сутыкаюцца розныя культурныя ўплывы, аднымі з носьбітаў якіх з’яўляюцца рэлігійныя кірункі. Калі казаць схематычна, праваслаўе арыентавана на Расію, праз каталіцтва і пратэстанцтва ажыццяўляецца арыентацыя на Еўропу і ЗША.

Шырока вядома канцэпцыя нямецкага сацыёлага пачатку мінулага стагоддзя М. Вебера, выкладзеная ў яго знакамітай працы «Пратэстанцкая этыка і дух капіталізму», згодна з якой узнікненне капіталізму было звязана з распаўсюджваннем пратэстанцкай працоўнай этыкі. Гэтая канцэпцыя неаднаразова крытыкавалася, тым не менш для нас яна цікавая тым што ў ёй, сапраўды, выяўлены тыя рысы пратэстанцкага веравучэння, якія адпавядаюць светапогляду эканамічна актыўнага індывіда.

На Беларусі зараз існуе феномен так званага «палескага неапратэстанцтва», калі пераважную колькасць веруючых ў вёсках на захадзе Гомельскай і ўсходзе Брасцейскай вобласці складаюць хрысціяне веры евангельскай (пяцідзясятнікі). Кожная пратэстанцкая суполка (гэта тычыцца і іншых накірункаў) уяўляе сабой калектыў аднаверцаў, якія дапамагаюць адзін аднаму, напрыклад, сумесна будуюць жытло. Калі дадаць да гэтага, што пратэстанты не ўжываюць алкаголь, і адным са сваіх абавязкаў перад Богам лічаць сумленную і напружаную працу, то ўзровень іх дабрабыту значна вышэйшы, чым у сярэднім па краіне [1, с. 4].

Актуальным з’яўляецца пытанне аб месцы рэлігіі ў грамадстве. Справа ў тым, што ў грамадскай свядомасці дагэтуль распаўсюджаны марксісцкія схемы тлумачэнне рэлігіі. Яна разглядаецца перш за ўсё як сродак суцяшэння чалавека ў яго жыццёвых цяжкасцях, а таксама аснова маральных паводзін. У нашай краіне пакуль што не

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

распрацаваны формы ўдзелу рэлігійных арганізацый ў грамадскім жыцці, лічыцца што яны павінны займацца перш за ўсё дабрачыннасцю. З іх дзейнасцю не звязваецца праблема змен у грамадстве, яго развіццё.

Другая, апроч марксісцкай, вядомая тэорыя аб антымадэрністскай сутнасці рэлігіі была распрацавана заснавальнікам пазітывізму А. Контам у яго знакамітым законе трох стадый развіцця культуры. Згодна з гэтым законам кожная з ідэй і галін чалавечых ведаў паслядоўна праходзіць тры розных стану : стан тэалагічны альбо фіктыўны, стан метафізічны альбо абстрактны, стан навуковы альбо пазітыўны. Конт лічыў, што ў Еўропе надыйшоў пазітыўны этап ў развіцці культуры, і навука дасць адказы на асноўныя светапоглядныя праблемы. Прыкладна з такіх пазіцый рэлігія крытыкуецца зараз : як нешта несучаснае і не адпавядаючае ўзроўню навуковых ведаў.

Трэба адзначыць, што працэс мадэрнізацыі грамадства прадугледжвае не толькі развіццё ранкавай эканомікі і дэмакратычных палітычных інстытутаў, але і фарміраванне свабоднай асобы. Менавіта наяўнасць апошняй большасцю даследчыкаў разглядаецца як адметная рыса еўрапейскай культуры : у адрозненні ад культур Усходу, дзе чалавек быў часткай надындывідуальных утварэнняў (племені, суполкі, дзяржав і г.д.), еўрапейская культура грунтавалася на ідэі свабоднай і актыўнай асобы. Таму зараз адным з фактараў мадэрнізацыі беларускага грамадства з'яўляецца, на наш погляд, ажыццяўленне права на свабоду сумлення.

Яно прадугледжвае, што чалавек можа самастойна вызначаць сваё стаўленне да рэлігіі, аднаасобна альбо сумесна з іншымі вызнаваць любую рэлігію або не вызнаваць ніякай, быць прыхільнікам той ці іншай рэлігіі альбо абыякавым да яе ці атэістам**.** Права на свабоду сумлення афіцыйна замацавана ў міжнародных дакументах і заканадаўстве большасці краін, у тым ліку і беларускім. Трэба падкрэсліць, што зараз асабліва актуальнай з'яўляецца менавіта рэалізацыя тых ці іншых правоў чалавека. Бо праз гэтую рэалізацыю адбываецццa трансфармацыя грамадства : па-першае, фарміруецца асоба чалавека як актыўны свабодны і самакаштоўны індывід і, па-другое змяняюцца ўзаемаадносіны паміж чалавекам і дзяржавай. Апошняя перастае быць ўсепранікаючым надындывідуальным інстытутам, які можа распараджацца любымі пытаннямі, і паступова набывае службовы характар.

Асаблівую актуальнась праблема мадэрнізацыі нашага грамадства набывае ў сувязі з поліканфесійнасцю рэлігійнага жыцця ў Беларусі. У адрозненні ад нашых суседзяў з усходу і захаду, Беларусь не з'яўляецца монаканфессійнай дзяржавай. У нас няма рэлігіі, якая б

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пераважала. На Беларусі зараз налічваецца 25 рэлігійных кірункаў. Калі выходзіць з колькасці зарэгістраваных на пачатак 2014 года рэлігійных суполак, дык найбольш вялікая канфесія – гэта праваслаўе (1 615 суполак), але таксама даволі шматколькаснымі з’яўляюцца пратэстанты (хрысціяне веры евангельскай – 520 суполка, евангельскія хрысціяне баптысты – 287) і каталікі (488 суполак). У гэтых умовах вельмі вялікае значэнне набывае пытанне аб свабодзе сумлення, якая ставарае магчымасць для сумеснага існавання і супрацоўніцтва людзей з рознымі поглядамі на рэлігію. На наш погляд, рэлігійная сфера можа зрабіцца ўзорам выпрацоўкі плюралізму думак.

Шэраг даследчыкаў разглядаюць мадэрнізацыю як працэс праблематызацыі грамадскага жыцця, калі нормы традыцыйнага грамадства страчваюць абавязковасць, і людзі самі выпрацоўваюць спосабы сваіх паводзін.

Таму адным са складнікаў мадэрнізацыі называюць секулярызацыю – вызваленне грамадства ад уплыву рэлігіі. Працэс секулярызацыі адбываецца ў Еўропе, пачынаючы з XV ст. Еўрапейская культура паступова набывала ўсё больш свецкі характар, і тыя яе галіны, у якіх раней кіраваліся рэлігійнымі нормамі, рабіліся самастойнымі і сталі развівацца, абапіраючыся перш за ўсё на свае ўласныя прынцыпы.

Секулярызацыя ў сферы культуры разумелася менавіта як вызваленне. Яго характар быў звязаны з дзвюма асноўнымі крытычнымі ўстаноўкамі пры аналізе ролі рэлігіі ў грамадстве. Яна магла разумецца як праява цемрашальства і забабонаў, і тады яе пераадольванне звязвалася з развіццём ведаў. Альбо рэлігія разглядалася як сацыяльны інстытут, які выкарыстоўваецца пануючымі класамі ў сваіх інтарэсах. Тады барацьба з рэлігіяй звязвалася з сацыяльнымі пераўтварэннямі.

Але ў любым выпадку пераадольванне ўплыву рэлігіі ў грамадстве разглядалася як частка агульнай устаноўкі еўрапейскай культуры на прагрэсіўнае развіццё. Лічылася, што яно забяспечваецца перш за усё праз распаўсюджванне навуковых ведаў і рацыянальную арганізацыю сацыяльнага жыцця.

Сучаснае еўрапейскае грамадства апісваецца як «постіндустрыяльнае», «постмадэрнае», «постсекулярнае». Апошняя характарыстыка азначае «вяртанне рэлігіі як важнага сацыяльнага інстытуту ў публічна-грамадзянскую прастору сучаснага грамадства. Постсекулярнае грамадства ў сваім рэальным сучасным стане і развіцці характарызуецца адраджэннем цікавасці шырокай грамадскасці не толькі да праблем рэлігіі, але і больш шырокай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

праблеме духоўнага быцця. Такое адраджэнне ў якасці аднаго з прыярытэтных сваіх накірункаў прапаноўвае прызнанне дарэчнасці і неабходнасці рэлігійных ідэй і духоўных прасвятленняў у арганізацыі публічнага дыскурсу дзеля недапушчэння, а ў выпадку неабходнасці выпраўлення сацыяльных паталогій сучаснага грамадства» [2, с. 62].

Распаўсюджванне рэлігіі ў постсавецкіх краінах з пункту погляду ўстановак еўрапейскай культуры Новага часу можа разглядацца як нейкі адкат у прагрэсіўным развіцці альбо праява спецыфікі гістарычных працэсаў у гэтых краінах, а менавіта – неабходнасці адмаўлення ад атэістычнага мінулага. Але дэсекулярызацыя ў канцы XX ст. мае і іншыя праявы. Паказальным для нас з’яўляецца не ўзмацненне пазіцый ісламу ва ўсходніх краінах, а пашырэнне сферы рэлігіі ў еўрапейскай культуры. Мы можам зрабіць выснову, што ў нас адбываюцца тыя ж працэсы, што і ў Еўропе ў цэлым.

Дэсекулярызацыя не абвяргае ўстаноўку еўрапейскага грамадства на прагрэсіўнае развіццё, але сведчыць пра яго больш складаны характар, чым гэта ўяўлялася мысліцелям Новага часу. Па-першае, ён мае нелінейны характар, і мы не можам папярэдне вызначыць яго накіраванасць і крытэрыі. Па-другое, у XX ст. была асэнсавана небяспека пабудовы грамадства ў адпаведнасці з жорстка вызначанымі рацыянальнымі схемамі, паколькі гэта прывяло да таталітарызму.

Пры гэтым, на наш погляд, трэба пазбягаць небяспекі іншай крайнасці, калі рэлігійнаму светапогляду прыпісваюцца ўсё магчымыя станоўчыя якасці, а атэістычнаму – ўсе адмоўныя. Атэізм і вальнадумства – неад’емныя складнікі еўрапейскай культурнай традыцыі. Дастаткова назваць імёны такіх мысліцеляў як Русо, Вальтэр, Феербах, Расэл, Сартр. Вальнадумцы і атэісты былі таксама і ў Беларусі : С. Будны, С. Лован, К. Бекеш, К. Лышчынскі.

Само функцыяванне вальнадумства і атэізму прадугледжвае наяўнасць у краіне пэўнай ступені свабоды думкі, а таксама вопыту палемікі паміж прыхільнікамі розных пунктаў погляду на рэлігію.

Такім чынам, ў сучасным грамадстве рэлігія займае іншае месца, чым ў традыцыйным альбо атэістычным. Ва ўмовах светапогляднага плюралізму яна зрабілася справай свабоднага выбару чалавека, які, адпаведна, нясе асабістую адказнасць за свае рэлігійныя погляды, і яны робяцца для яго больш значнымі. Мы лічым, што пашырэнне сферы рэлігіі ў нашай краіне – доўгатэрміновы працэс, ён будзе не толькі пашырацца, але таксама паглыбляцца, і гэта з’яўляецца не толькі паказчыкам, але і фактарам мадэрнізацыі грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры


1. Макарэвіч С. Альшанскі цуд : вёска, якая абвергла Карла Маркса : пра пратэстанцкую вёску // Наша Ніва. 2014. № 39) С. 4–6.
2. Бабосов Е. М. Социодинамика религиозности в современном белорусском обществе // Социология. 2013. № 3. С. 62–68.



УДК 141.201.1:316.733



**В. М. ГАЛКИН**
(УО «Гомельский государственный университет им. Ф. Скорины»)


# СУБЪЕКТИВНОСТЬ В «КОНЦЕ ИСТОРИИ» : К ПРОБЛЕМЕ НЕОРИТОРИЧЕСКИХ ТРАНСФОРМАЦИЙ


*В статье затрагивается проблематика кризиса классического субъекта. В контексте рассмотрения сложившихся в тематической литературе подходов к её освещению ставится вопрос об актуальности критического анализа последствий неориторического сдвига в понимании и производстве субъективности.*


Проблематизация субъективности лежит в имманентных закономерностях эволюции метафизики философского субъекта и в социально-антропологических и экзистенциально-феноменологических ситуациях, проявляющих условия и обстоятельства существования его телоса. Как критическая социальная онтология философии, описывающая связь смены философских парадигм понимания субъективности и общественных парадигм субъекта, так и рефлексивная философия показывают, что проблема субъективности дополнительно высвечивает ряд вопросов современного постфилософского дискурса [1].

Очевидно, первым, кто реалистично начал уходить от исследования эгологических (в картезианском и классически-немецком понимании) структур сознания и приближаться к коммуникативным характеристикам сознания, был Э. Гуссерль. В своих «Картезианских размышлениях», основываясь на допущении о фундаментальности опыта самосознания, он предпринял попытку демонстрации из этого опыта «некоего сообщества монад», «трансцендентальной субъективности» (или того, что в дальнейшем терминологически закрепилось под именами «другое Я» или


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ